УДК 376.3:378
ББК 74.3:74.58
Д39

**Редакционная коллегия:**

Л. И. Алексина, З. А. Апацкая, Т. В. Варёнова, Т. А. Григорьева, З. Г. Ермолович (отв. редактор), Л. А. Зайцева, И. В. Зыгманова.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Д39 **Дефектологическое** образование в Республике Беларусь: состояние и перспективы: Материалы Респ. науч.-практ. конф., Минск, 29–30 мая 2001 г.: В 2 ч. – Мн.: БГПУ им. М. Танка, 2001. Ч. I. – 245 с.

ISBN 985-435-344-3

В сборнике представлен обзор состояния, перспектив развития дефектологического образования, а также путей и средств совершенствования специального образования в Республике Беларусь.

Сборник адресован научным сотрудникам и практическим работникам в области дефектологии.

**ББК 74.3:74.58**

ISBN 985-435-344-3
ISBN 985-435-346-X

© Коллектив авторов, 2001

# СТАН І ПЕРСПЕКТЫВЫ ЎДАСКАНАЛЕННЯ ПЕРАПАДРЫХТОЎКІ НАСТАЎНІКАЎ–ДЭФЕКТОЛАГАЎ У СІСТЭМЕ ПАСЛЯДЫПЛОМНАЙ АДУКАЦЫІ

**Андарала А.І. (г. Мінск)**

Дынамічныя сацыяльна–эканамічныя і культурна–гістарычныя змены, якія адбываюцца ў нашай краіне, абвастрылі праблему прафесійнай мабільнасці. Ва ўмовах рыначнай эканомікі чалавеку прыходзіцца неаднаразова павышаць сваю кваліфікацыю, падчас атрымліваць дадатковую спецыяльнасць, мяняць сваю прафесію. Гэта абумовіла неабходнасць стварэння ў краіне сістэмы бесперапыннай адукацыі.

Найбольш высокія патрабаванні сістэма бесперапыннай адукацыі прад'яўляе да настаўніка. Адной з умоў існавання аптымальнай мадэлі падрыхтоўкі настаўнікаў ва ўмовах бесперапыннай адукацыі з'яўляецца наяўнасць у ёй падсістэмы паслядыпломнай адукацыі. Менавіта яна прадугледжвае стварэнне адукацыйных структур, якія дазваляюць павышаць кваліфікацыю або авалодваць іншай спецыяльнасцю.

Сёння паслядыпломная адукацыя педагагічных кадраў уяўляе сабой сукупнасць абласных, гарадскіх інстытутаў удасканалення настаўнікаў, якія існуюць пры адпаведных упраўленнях адукацыі, і факультэтаў павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў сістэмы адукацыі пры ВНУ.

Факультэт павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў сістэмы адукацыі, які дзейнічае пры Беларускім дзяржаўным педагагічным універсітэце імя Максіма Танка, пачаў сваё існаванне толькі ў верасні 2000 года. Стварэнне факультэта было абумоўлена неабходнасцю і жаданнем універсітэта больш актыўна і дзейсна адгукацца на патрэбы сучаснай школы.

На сённяшні дзень факультэт ажыццяўляе перападрыхтоўку педагагічных кадраў па некалькіх спецыяльнасцях, у тым ліку і па дэфекталогіі.

З адкрыццём у БДПУ імя Максіма Танка факультэта павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў сістэмы адукацыі паслядыпломнае навучанне дэфектолагаў атрымала новыя мэтавыя накірункі. У першую чаргу яно служыць павышэнню кваліфікацыі працуючых настаўнікаў–дэфектолагаў, якія маюць вышэйшую педагагічную адукацыю, але не маюць адпаведнай кваліфікацыі. Можна адзначыць, што гэта сябе цалкам і поўнасцю апраўдала, таму што спецыфіка завочнай адукацыі і заключаецца ў тым, што эфект навучання дасягаецца толькі тады, калі профіль вучобы, яе змест маюць

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

непасрэдную сувязь з характарам працы слухачоў. Сёння ўсе 175 слухачоў–дэфектолагаў працуюць непасрэдна па спецыяльнасці перападрыхтоўкі.

Трэба адзначыць, што поспех камплектавання факультэта слухачамі з ліку тых, хто працуе ва ўстановах спецыяльнай адукацыі, у многім вызначаецца высокім узроўнем сувязяў факультэта з упраўленнем спецыяльнай адукацыі Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь і адпаведнымі структурамі абласных і Мінскага гарадскога ўпраўлення адукацыі.

У апошнія гады ў рэспубліцы інтэнсіўна развіваецца сістэма інтэграванага навучання. Таму ў школах узнікла вострая патрэба ў настаўніках–дэфектолагах. Менавіта гэта абумовіла некаторае пашырэнне прыёму на дэфекталагічнае аддзяленне перападрыхтоўкі. Так, у апошнія гады план прыёму ўзрос з 25 да 75 чалавек. Аднак для эфектыўнай работы сённяшніх навучальных устаноў гэтага недастаткова. На нашу думку, павінны быць створаны больш шырокія магчымасці для перападрыхтоўкі настаўнікаў–дэфектолагаў праз структуру паслядыпломнай адукацыі. У гэтым плане самым значным патэнцыялам валодае БДПУ імя Максіма Танка, дзе на пяці спецыяльных кафедрах дэфекталагічнага факультэта працуе 90% навукоўцаў–дэфектолагаў рэспублікі.

Адным з асноўных звенняў удасканалення навучання слухачоў перападрыхтоўкі з'яўляецца паляпшэнне стану вучэбна–выхаваўчай работы. Важную ролю ў гэтым адыгрывае ўдасканаленне вучэбна–метадычнай дакументацыі.

Спецыфіка вучэбнага плана ў сістэме перападрыхтоўкі заключаецца ў тым, што ён больш мабільны, чым вучэбны план класічнага дэфекталагічнага факультэта, так як ён павінен не радзей, чым раз у два гады, абнаўляцца. Дадзеная акалічнасць дае магчымасць уносіць у вучэбны план змены ў адпаведнасці з працэсамі, якія адбываюцца ў адукацыі. Гэта ўсё знайшло сваё адлюстраванне і ў новым вучэбным плане, падрыхтаваным факультэтам у 2001 годзе. Перападрыхтоўка слухачоў–дэфектолагаў па завочнай форме навучання ажыццяўляецца ў адпаведнасці з распрацаваным вучэбным планам, прадугледжвае больш за 1000 гадзін вучэбных аудыторных заняткаў і складаецца з трох асноўных блокаў. Першы блок у аб'ёме 80 гадзін складаюць гуманітарныя і сацыяльна–эканамічныя дысцыпліны. У другі структурны блок вучэбнага плана ўваходзяць агульнанавуковыя і агульнапрафесійныя дысцыпліны. Іх аб'ём складае 10% ад усяго курса перападрыхтоўкі. Асноўнае месца ў вучэбным плане займаюць дысцыпліны спецыяльнасці, якія ў сваёй сукупнасці прадугледжваюць 820 гадзін аудыторных вучэбных заняткаў. Больш дасканалай стала сістэма вывучэння грамадскіх навук. Асаблівая ўвага ў вучэбным плане надаецца павышэнню ўзроўню псіхолага–педагагічнай падрыхтоўкі настаўніка–дэфектолага. Многа новаўводзін і ў дысцыплінах спецыяльнасці. Напрыклад, у плане з'явіўся новы курс "Інтэграванае выхаванне і навучанне".

Вучэбнаму працэсу мы імкнёмся надаць планамерны і арганізаваны характар. Для гэтага на аснове вучэбнага плана распрацоўваецца вучэбны графік на ўвесь тэрмін навучання. Яго атрымлівае кожны слухач на першай, устаноўчай, сесіі. Такі графік дае слухачам поўнае ўяўленне аб аб'ёме вучэбнага матэрыялу, які належыць засвоіць за перыяд навучання на факультэце, дапамагае спланаваць самастойную працу ў міжсесійны перыяд, загадзя падабраць літаратуру, неабходную для падрыхтоўкі да курсавых экзаменаў і залікаў, выканання курсавых прац.

Як вядома, самастойная вучоба — асноўная форма дзейнасці слухача–завочніка. Менавіта таму пры распрацоўцы новага вучэбнага плана значны акцэнт быў зроблены на самастойную працу.У сувязі з гэтым як станоўчы факт можна адзначыць накірунак педагагічнага калектыву факультэта на насычэнне вучэбнага працэсу перападрыхтоўкі дэфекталагаў вучэбна–метадычнай літаратурай, якая аказвае вялікую дапамогу слухачам–завочнікам у самастойнай працы. Выкладчыкамі дэфекталагічных дысцыплін, акрамя метадычных распрацовак па адпаведных курсах і асобных праблемах, створана значная колькасць цікавых і карысных распрацовак агульнаметадычнага характару.

У сістэму арганізацыі самастойнай працы слухачоў–завочнікаў факультэта актыўна ўводзіцца элемент кантакту слухача з выкладчыкамі. Гэтаму, як сведчыць практыка, у многім садзейнічае правядзенне дзён завочніка ў апошнюю нядзелю кожнага месяца. У гэтыя дні слухачы маюць магчымасць здаць экзамены, залікі, атрымаць кансультацыю. Атрымалі распаўсюджанне пісьмовыя кансультацыі. Апраўдвае сябе і павелічэнне колькасці экзаменацыйных сесій да трох.

Значная ўвага на факультэце таксама надаецца падбору тэм курсавых прац, кантролю за іх падрыхтоўкай і абаронай. Курсавыя працы слухачоў — гэта своеасаблівыя невялікія навукова–педагагічныя даследаванні, дзеля напісання якіх даводзіцца інтэнсіўна працаваць, мабілізуючы ўсе тэарэтычныя веды, выкарыстоўваючы дасягненні навукі, перадавы вопыт. Выкананне такіх курсавых прац патрабуе пэўнай падрыхтоўкі слухачоў да даследчай дзейнасці (уменне праводзіць сацыялагічнае даследаванне, абагульняць асабісты педагагічны вопыт і вопыт сваіх калег). Па выніках абароны аўтарам лепшых курсавых прац дазваляецца падрыхтоўка выпускных дыпломных прац.

Практыка паказала, што многія выпускнікі даволі эфектыўна працуюць над напісаннем дыпломных прац, чаму ў значнай ступені дапамагае іх практычная дзейнасць. У 2000 годзе з 22 выпускнікоў дыпломныя працы абаранілі чатыры чалавекі. Дзяржаўная камісія дала ім высокую ацэнку — усе атрымалі адзнаку "выдатна". Нам бачыцца карысным і далей развіваць практыку напісання слухачамі курсавых і дыпломных прац.

Сістэма вучэбных заняткаў і самастойнай працы слухачоў–завочнікаў арганічна звязана з арганізацыяй кантролю. Таму на факультэце вядзецца

распрацоўка сістэмы папярэджання непаспяховасці і павышэння якасці ведаў слухачоў. Яна павінна ўключаць у сябе спецыяльныя формы ўліку паспяховасці і прадугледжваць своечасовае прымяненне разнастайных вучэбна–выхаваўчых мер.

Ацэнка эфектыўнасці працы слухача–завочніка і ўзроўню яго ведаў ажыццяўляецца перш за ўсё на экзаменах і заліках, а выніковая атэстацыя — на дзяржаўных экзаменах. Сёння можна адзначыць тэндэнцыю павышэння якасці дзейнасці завочнай перападрыхтоўкі і ўзроўню падрыхтоўкі настаўнікаў–дэфектолагаў.

Як указвалася ў справаздачы Дзяржаўнай экзаменацыйнай камісіі за 2000 год, выпускнікі аддзялення дэфекталогіі маюць дастатковую спецыяльную педагагічную падрыхтоўку для паспяховай працы ў школе ў якасці настаўніка–дэфектолага.

Вынікі дзяржаўных экзаменаў, анкетаванне саміх выпускнікоў і кіраўнікоў навучальных устаноў даюць падставу сцвярджаць, што перападрыхтоўка сябе цалкам і поўнасцю апраўдвае.